*А. Трусаў*

# МІРСКІ ЗАМАК. АРХЕАЛОГІЯ ПАМЯЦІ

## Шлях да прафесіі

Я скончыў школу ў Мсціславе ў 1971 г., у 1976 г. — гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. З дзяцінства была мара — стаць археолагам. Аднак вечна вагаўся: ісці вучыцца на медыка ці на археолага. Калі прыехаў у Мінск падаваць дакументы, спачатку пайшоў у медінстытут — туды маглі залічыць без экзаменаў, бо акрамя залатога медаля ў мяне быў дыплом пераможца абласной алімпіяды па біялогіі. А гэта прывілеі выпускніка-выдатніка савецкай школы!

Чалавек, які прымаў дакументы, спытаў, ці быў я калі ў моргу. Вядома, не. Морг быў побач з вучэбным корпусам. Далі мне пропуск, пайшоў у морг, убачыў нябожчыкаў. О, не!.. Аднак жыццё не раз сутыкала мяне з нябожчыкамі, дакладней з іх парэшткамі, калі стаў археолагам. Колькі я іх адкапаў! Так што ў жыцці ўсё ўзаемазвязана.

Стаць археолагам задумаў, калі нас, дзяцей, у другім ці трэцім класе павяла на раскопкі на Замкавую гару ў маім родным горадзе мая першая настаўніца, маці вядомага археолага, вучонага Міхася Ткачова. На глыбіні некалькіх метраў я ўбачыў падземны горад, драўляныя маставыя...

Ва ўніверсітэце пашанцавала на выкладчыка. Увогуле, мне шанцуе на цікавых людзей. З якімі толькі знакамітасцямі не давялося сустрэцца, пачынаючы ад прэзідэнтаў і палітыкаў... Я ўдзячны Богу за такі лёс.

Я быў сярод першых выпускнікоў кафедры археалогіі, якую ў 1973 г. стварыў прафесар Эдуард Міхайлавіч Загарульскі. Першым ішоў на размеркаванні — закончыў універсітэт з чырвоным дыпломам. Чаму не называюць такі дыплом «дыплом выдатніка»? Згадзіцеся, у гэтым было б больш логікі.

Абяцанае раней мне месца выкладчыка на кафедры археалогіі, як гэта часта бывае, заняў іншы чалавек. Ісці ў аспірантуру і пісаць дысертацыю па навуковым камунізме не захацеў. Я археолаг!

Пашанцавала. На размеркаванне прыйшоў Сяргей Аляксандравіч Друшчыц, галоўны архітэктар Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў Міністэрства культуры. Ім трэба археолаг!

Памятаю першы савет. Выступаў Алег Хадыка, абмяркоўвалі праект рэстаўрацыі. І я з жахам адчуў, што я, выпускнік універсітэта, былы ленінскі стыпендыят, нічога не ведаю пра нашы замкі, не ведаю ніводнага архітэктурнага тэрміна. Так атрымалася, што архітэктурную тэрміналогію я асвойваў з дапамогай найлепшых археолагаў архітэктуры Савецкага Саюза — Валянціна Булкіна, Паўла Аляксандравіча Рапапорта, аднаго з найлепшых рэстаўратараў Ноўгарада Рыгора Штэндара. Вось мае настаўнікі.

Не забыць тое лета 1976 г., камандзіроўку ў Полацк, раскопкі Сафійскага сабора, наказ Друшчыца: «Едзь, вучыся». Месяц я працаваў з ленінградскімі археолагамі, братамі Булкінымі — Валянцінам і Васілём. Потым у Полацк прыехалі Павел Рапапорт, наўгародскі рэстаўратар і архітэктар Штэндар. Вывучалі Спаса-Еўфрасіннеўскую царкву. Мне даручылі закласці шурф, і я гэты шурф выкапаў уласнымі рукамі. Штэндар вучыў мяне так: стукнуся галавой аб што-небудзь на гарышчы, а ён кажа: «Вось, Алег, ты ўдарыўся аб закамару». Гэта ён прыдумаў мне тэму кандыдацкай дысертацыі. Яе зацвердзілі, калі я неўзабаве паступіў у завочную аспірантуру нашай Акадэміі навук, кіраўніком быў Георгій Васільевіч Штыхаў.

Абараняўся я ў Ленінградзе, у доктарскім савеце, гэтаму спрыяў Павел Аляксандравіч Рапапорт, яму хацелася паказаць, што я яго вучань. Быў 1981 год.

На абароне былі найлепшыя людзі навукі, сярод іх — дырэктар Дзяржаўнага Эрмітажа Барыс Барысавіч Піятроўскі. Падаю яму аўтарэферат кандыдацкай, ён адгарнуў першую старонку. «Ну, молодой человек вообще обнаглел. По каким таким кирпичам диссертацию хочет защитить? Не нужен мне твой реферат». І кінуў мне яго назад. «Не нужен, так не нужен». Забіраю. Абарона перад Новым годам ішла некалькі гадзін, пытанняў было шмат, усе прагаласавалі «за», а Піятроўскі сказаў: «Знаете, молодой человек, я свое мнение изменяю. Дайте мне свой реферат, может, он мне пригодится». Гэта для мяне была самая бліскучая адзнака!

Праз тры месяцы з Масквы прыйшло паведамленне, што ВАК маю дысертацыю па тэме «Памятники белорусского монументального зодчества XI—XVII вв.» з акцэнтам на будаўнічыя матэрыялы і методыку археалагічных раскопак зацвердзіў. Я стаў фактычна кандыдатам навук у галіне архітэктурнай археалогіі.

## Першыя самастойныя раскопкі

Самае галоўнае, за што я ўдзячны кіраўніку майстэрняў, галоўнаму архітэктару і старэйшаму сябру Сяргею Друшчыцу, — за знаёмства з беларускай інтэлігенцыяй. Гэта быў сапраўдны беларускі патрыёт. Яго дзядзька, вядомы гісторык, дацэнт Васіль Друшчыц быў рэпрэсіраваны ў сталінскія часы. Сяргей быў з гэтай сям'і. Калі па размеркаванні я прыйшоў на працу ў майстэрні, я пачуў цудоўную бела-

рускую мову. Па-беларуску размаўлялі цэлыя аддзелы! Вёў творчыя семінары Алег Хадыка, эрудыт, філосаф, унікальны чалавек. Працавалі ў нас пісьменнік і фатограф, майстар выцінанкі Вячаслаў Дубінка, а таксама сын Максіма Танка. Рэстаўрацыйныя майстэрні былі сапраўдным асяродкам нацыянальнай беларускай патрыятычнай інтэлігенцыі. Пра іх у 1990-я гг. знялі фільм «Дзеці Піранэзі». Я быў тады зусім малады. Гэтыя людзі, можна сказаць, выхавалі мяне беларусам.



*Алег Хадыка з маці. Мінск. 2005. Фота А. Радзівонава*

І вось першае заданне — самастойныя археалагічныя раскопкі Лідскага замка. Пачалася рэстаўрацыя. Я адначасова гісторык і археолаг, бо рабіў гістарычныя даведкі і раскопкі. На той час я ўжо ўмеў капаць помнікі XII ст., а тут готыка. Вучыўся ў найлепшых археолагаў Літвы: быў на стажыроўцы ў Вільнюсе, Каўнасе, не раз наведаў Тракайскі замак. У Польшчы пазнаёміўся з Тадэвушам Полякам, кіраўніком польскай рэстаўрацыі, унікальным чалавекам, родам з Беларусі.

Маё прафесійнае станаўленне адбывалася праз школу не толькі прафесійных савецкіх археолагаў з Расіі, але і літоўскіх, і польскіх. Першы аб'ект, на якім я паспяхова зрабіў навуковую кар'еру, — замак у Лідзе. На вокладку манаграфіі, якая выйшла ўвосень 2020 г., я свядома змясціў выяву менавіта гэтага помніка архітэктуры.

Я капаў не толькі замкі. У 1979 г. даследаваў Магілёўскую ратушу, у Мінску — гандлёвыя рады.

Мір — мой трэці значны аб'ект, трэці замак. Калі я прыехаў сюды ў 1980 г., быў у захапленні: гэта надзвычай цікавы помнік! Але раней так не лічылі. XVI–XVII стст. увогуле не разглядалі як каштоўнасць.

## Пачатак раскопак у Мірскім замку

Дарэчы, я даказаў, што да замка на гэтым месцы жылі людзі. Падчас раскопак пасярод двара я выйшаў на паселішча XV ст. Значыць, замак будавалі не на пустым месцы. У пласце XV ст. выявіліся сляды пажару. На гэтым месцы магнат Ільініч і пачаў будаваць замак, а дагэтуль тут гаспадарыў нехта баярын Сенька Гедыгольдавіч. Яго сядзібу я і знайшоў.



*Раскоп А. Трусава паселішча Сенькі Гедыгольдавіча (XV ст.) у двары Мірскага замка. 2008. Фота Н. Усавай*

Мірскі замак — гэта каля 10 гадоў майго жыцця.

Як ішлі раскопкі? Пераважна земляныя работы ажыццяўлялі студэнты розных навучальных устаноў. Працавалі хлопцы і дзяўчаты з нефармальных моладзевых аб'яднанняў «Майстроўня» і «Талака». Тут таксама пад маім кіраўніцтвам праходзілі палявую археалагічную практыку студэнты Мінскага педінстытута. Былі і студэнты з Гродзенскага ўніверсітэта. Дзе мы жылі? У самых розных месцах, нават у палатках. У Міры была гасцініца, але пераважна жылі мы ў закінутай школе, недалёка ад замка, амаль у спартанскіх умовах. Спалі хто ў спальніку, хто пад коўдрай, прывезенай з дому, часам мясцовыя чыноўнікі маглі паклапаціцца пра раскладушкі.

Пазней на базе гэтай школы зрабілі вучэльню разьбяроў...

Быў час, калі мы жылі ў былым комплексе яўрэйскай акадэміі, не ў самой іешыве, а ў будынку побач. Маладосць, рамантыка. Самі гатавалі ежу. Часам хадзілі ў мясцовую сталоўку. Каб наладзіць побыт экспедыцыі, загадзя ездзіў у Мір, з мясцовымі ўладамі «пракручвалі» розныя варыянты.

Улетку ў Мірскім замку, акрамя працы, віравала культурнае жыццё. Ладзілі вандроўкі па наваколлі, пешкі туды і назад праз вёску Паланэчка (а гэта ўжо Баранавіцкі раён) хадзілі, каб пабачыць касцёл XV ст. у вёсцы Ішкалдзь.

Студэнты — народ крэатыўны. Пасвячэнне ў рыцары, гульні, увечары збіраліся каля вогнішча, спявалі беларускія песні, самая любімая — «Басота». Чытаў ім лекцыі, архітэктурныя тэрміны доўга тлумачыць не трэба было. Большасць дакументацыі рабілі па-беларуску. На той час я ўжо быў сакратаром партыйнай арганізацыі ў майстэрнях. Пачыналася перабудова. Наша партыйная арганізацыя перайшла на беларускую мову. Якія там былі камуністы? Усе патрыёты!

Што да Міра, то, безумоўна, вялікая роля належыць архітэктару Валянціну Калніну. Алег Хадыка яго натхняў, мог падаць ідэю. Пазней быў распрацаваны новы праект рэстаўрацыі, кіраўнікі Сяргей Верамейчык і Вольга Атас.

Існуюць тры канцэпцыі адраджэння замка — Валянціна Калніна, Сяргея Верамейчыка і Дзмітрыя Бубноўскага. Канцэпцыя Калніна палягала ў аднаўленні замка і пераўтварэнні яго ў цэнтр культуры. Пра гэта Калнін выдаў кнігу. Канцэпцыя Верамейчыка і Атас прадугледжвала зрабіць у замку школу мастацтва. На думку аўтараў, замак павінны аднаўляць самі мастакі (там мастацкая вучэльня і адкрылася). Іх канцэпцыя — стварыць зоны рэстаўрацыі, зоны мастацтва. Гэта канцэпцыя таксама надрукавана. А потым справу перадалі Дзмітрыю Бубноўскаму, архітэктару, нараджэнцу Міра, ён і давёў усё да лагічнага завяршэння.



*Пасяджэнне рабочай групы па музеефікацыі Мірскага замка ў музеі. На здымку: старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА У. Шчасны, супрацоўнікі музея Н. Калашнік, А. Карпенка, Н. Усава, П. Пракапцоў, Л. Сысоева, археолагі П. Русаў, А. Трусаў. 2009. Фота З. Казлова*

Праект Бубноўскага можна крытыкаваць, шмат хто гэта рабіў, я таксама рабіў заўвагі. Але калі параўнаць рэстаўрацыю Мірскага замка нават з Нясвіжскім, не кажучы ўжо пра Стары замак у Гродне, рэстаўрацыя Бубноўскага мне падабаецца найбольш. Ён максімальна захаваў аўтэнтыку. Вазьміце зандаж. Гэта ўнікальная з'ява – нідзе, ні ў адным музеі свету вы не ўбачыце ў інтэр'ерах такі вялікі мур нечапаным. Там усё бачна. Бубноўскага крытыкавалі за ўстаўленыя там сучасныя шклопакеты. Аднак было б смешна, каб ён уставіў псеўдашкельцы XVII ст., якіх ніхто не бачыў. Я знаходзіў толькі кавалачкі.

А так – ёсць акно, і гэта добра. Крытыкавалі Дзмітрыя і за тое, што ён зрабіў ліфт. Але гэту частку ў свой час перабудаваў князь Святаполк-Мірскі, аўтэнтыка, якая заставалася, была знішчана. Тым не менш добра, што быў такі князь Мікалай Святаполк-Мірскі, які ў канцы XIX ст. за вялікія грошы набыў замкавы комплекс. Тое, што зрабілі Святаполк-Мірскія, Бубноўскі захаваў. Хацелася некаторым знесці балкончык з відам на возера, але Бубноўскі яго захаваў. Я падтрымаў Дзмітрыя не рабіць стайні Радзівілаў XVII ст. Калі імі закрыць аўтэнтычныя сцены XVI ст., гэта будзе няправільна.

Бубноўскі як рэстаўратар – прафесіянал, на маю думку, зрабіў не горш, чым Друшчыц у Нясвіжы. А можа і лепш. У Нясвіжы разбіралі цэлыя карпусы і рабілі нанова. У Міры нічога не разбіралі. Раскопкі былі ўдалыя. Чаго я толькі не адкапаў!



*Паліхромная кафля з Мірскага замка. Раскопкі А. Трусава. 1988. Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 1991. Фота Г. Ліхтаровіча*



*Паліхромная геральдычная кафля з Мірскага замка. XVII ст. Раскопкі А. Трусава. 1988. Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 1991. Фота Г. Ліхтаровіча*

Паўтаруся. Пад замкам я знайшоў паселішча — самае галоўнае адкрыццё. Знайшоў хату, якая там была, тры віды кафлі. Сапраўдныя кафлі XV ст.!

Зараз мірская кафля знаходзіцца ў розных музеях. Шмат іншых цікавых знаходак. Але была праблема: куды гэта багацце дзяваць? Я павінен быў аддаваць замоўцу. Замоўцам доўгі час было Гродзенскае ўпраўленне культуры, але там знаходкі не бралі. У музеі таксама казалі: не, бітыя чарапкі нам не трэба. Але я знайшоў цудоўнага кераміста Уладзіміра Угрыновіча, які стаў маім добрым сябрам. Ён са сваімі студэнтамі Тэатральна-мастацкага інстытута пачаў кафлю аднаўляць. Цэлую кафлю ахвотна бралі музеі, плацілі за рэстаўрацыю грошы. Частка кафлі з Мірскага замка знаходзіцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У мастацкім музеі ёсць кафля не толькі з Мірскага замка, але з усіх маіх раскопак на тэрыторыі Беларусі.

Ёсць у Гродзенскім музеі, у Нацыянальным гістарычным музеі, у Карэлічах. Спадарыня Надзея Высоцкая, кіраўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва мастацкага музея, брала матэрыялы для экспазіцыі толькі ў адноўленым стане або фрагменты буйных памераў.

Я ведаў мужа Высоцкай, рэдактара Генадзя Галубовіча. Дзякуючы яму выйшаў альбом «Беларуская кафля» на шасці мовах (аўтары-складальнікі В. Собаль, М. Ткачоў, А. Трусаў, У. Угрыновіч).

Спадарыня Высоцкая зрабіла вельмі многа для беларускага адраджэння, яе альбомы пра мастацтва краіны адкрывалі людзям новую невядомую гісторыю, невядомую ім культуру.



*Рэканструкцыя мірскай кафлі XVI—XVIII стст. у экспазіцыі паўночна-заходняй вежы. Замкавы комплекс «Мір». 1992. Фота Г. Ліхтаровіча*



*В. Собаль, А. Трусаў, У. Пракапцоў у Мірскім замку. 2008. Фота З. Казлова*

Паралельна з археалагічным вывучэннем замка мы даследавалі мястэчка Мір. Многія археолагі – мае сябры крытыкавалі рэстаўрацыю Мірскага замка. І хвалілі рэстаўрацыю Нясвіжскага. Я з імі не згодны. Мірскі замак, на маю думку, – найлепшы.

Мірскі замак стаў музеем даволі позна. Мае апошнія раскопкі тут былі ў 1991 г., музей толькі пачаў стварацца. У 1992 г. для экспанавання адкрылі толькі адну вежу.

Я быў на адкрыцці. Прыязджалі Старшыня Парламента Станіслаў Шушкевіч, Прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч, Міністр замежных спраў Пётр Краўчанка. Гэта было вялікае свята. І вялікая радасць для мяне асабіста.

Кіраўнікі мастацкага музея Юрый Карачун, а потым Уладзімір Пракапцоў падчас рэстаўрацыі замка запрашалі для кансультацый розных спецыялістаў, ладзілі канферэнцыі, выдавалі зборнікі, бо ісціна – якая пасярэдзіне – нараджаецца ў спрэчках, дыскусіях.



*Экспазіцыі вынікаў археалагічных раскопак А. Трусава ў паўночна-заходняй вежы. 1992. Фота О. Ліхтаровіча*



*Выязное пасяджэнне навукова-метадычнай рады ў Мірскім замку. На здымку: А. Карпенка, У. Кура... С. Каткова, А. Трусаў, В. Скалабан. 2005. Фота З. Казлова*

Між іншым, дазволю сабе рэмарку. Ідзе рэстаўрацыя Старога замка ў Гродне. Гэта таксама «мой замак», я яго капаў, але... У Гродна мяне ніхто не запраша... быццам мяне там ніколі не было. Там свае кансультанты. Чытаю ў інтэрнэце пр... ход рэстаўрацыі – часам смешна, часам вельмі сумна. Трэба ўсё ж раіцца са спе... цыялістамі.

Палацава-замкавы комплекс у Міры аднавілі. Зараз гэта нармальны музейны комплекс, які мае наведвальнікаў, прыносіць прыбытак.

Мы не бедныя – і замкі ў нас ёсць, і палацы, і паланэзы. Адраджэнне 90-х г... XX ст. – перыяд спрэчны, але ён, я сказаў бы, вельмі важны. У незалежнай краіне вырасла незалежнае пакаленне. Яно выхоўвалася ў тым ліку і на велічы Мірскага замка, Нясвіжскага, на нашых кнігах. Шмат зроблена за гэты час.

Роля А. Лукашэнкі, першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, таксама немалая. Я яго ведаю асабіста, з 1990-х гг., калі мы былі першымі дэпутатамі незалежнай Беларусі. Мы былі ў апазіцыі да ўлад.

У сакавіку 2020 г. па запрашэнні мы з Валянцінам Голубевым былі на сустрэчы (вялікая сустрэча Прэзідэнта з прадстаўнікамі інтэлігенцыі, дэпутатамі, журналістамі). Ён і пра нас успомніў. У інтэрнэце я падтрымаў пазіцыю Прэзідэнта аб не...

залежнасці краіны. Я дзяржаўнік і гляджу на гісторыю з далёкай перспектывы. Я не ў тым узросце, каб паддавацца эмоцыям. Эмоцыі — не лепшы дарадчык, перамагае той, хто можа свае эмоцыі прыглушыць, схаваць, нешта забыць, а потым успомніць...

Думаю, Прэзідэнту прыемна было прыйсці ў Мірскі замак, урачыста адкрыць яго ў 2010 г. Без яго спрыяння (асабліва што датычыць фінансавання) малаверагодна, каб такая ўрачыстасць адбылася. А колькі грошай далі на Нясвіж! Пачалі рабіць Каралеўскі палац у Гродне. Дзякуючы А. Лукашэнку аднавілі Магілёўскую, Шклоўскую і Чачэрскую ратушы.

У Вярхоўным Савеце XII склікання я быў намеснікам старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. Будучы дэпутатам, Аляксандр Рыгоравіч прыхільна ставіўся да рэстаўрацыі, да аднаўлення помнікаў. На гэтай глебе мы знаходзілі паразуменне. Яму хацелася адрадзіць ратушу ў Шклове, на сваёй радзіме. Мы раіліся, як гэта ажыццявіць. І, як толькі ён стаў Прэзідэнтам, — ратушу адрадзілі.



*Муляж печы ў сталовай ізбе. Кафля з гербам Радзівілаў, аднаўленая па ўзорах раскопак А. Трусава. 2009. Фота Н. Усавай*

Аднаўляць Магілёўскую ратушу пачалі яшчэ ў 1979 г., калі я правёў там археалагічныя раскопкі. У пачатку 1991 г. заклалі падмурак, потым засыпалі. Пазней да А. Лукашэнкі звярнуліся патрыёты горада з просьбай дапамагчы з фінансаваннем. Увосень 2007 г. Прэзідэнт прыязджаў у Магілёў і заклаў капсулу з пасланнем да нашчадкаў.

Магілёўскія ўлады зрабілі заказ кнігі пра ратушу. З Аляксандрам Агеевым, мясцовым гісторыкам, мы такую кнігу напісалі. У 2008 г. у прыгожай вокладцы, з цікавымі каляровымі ілюстрацыямі яна выйшла ў свет. У 2010 г. з'явілася дапоўненае выданне.

За гады незалежнасці ў Беларусі адрадзілі столькі помнікаў, пра якія ў маладосці я нават не думаў. Культавыя будынкі, замкі, палацы, ратушы. Гэтым наша краіна, сярод іншага, пазіцыянуе сваю самадастатковасць, сваю даўнюю гісторыю і багатую культуру.

А Мірскі замак? Жыве і будзе жыць!